Заяц Н.В. (Мінск)

# МАСТАЦКАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ МІНУЛАГА Ў ПАЭМЕ ВАСІЛЯ ЗУЁНКА “ЛУКАМ’Е”

Паэма “Лукам’е” (1980–1983), уключаная ў пенталогію “Пяцірэчча”, – адзіны ліра-эпічны твор В. Зуёнка, дзе далёкая гісторыя народа выходзіць на першы план, поўнасцю авалодвае ўвагай мастака. Больш за дзесяць гадоў да яго публікацыі ў адной з рэцэнзій І. Шпакоўскі звярнуў увагу на пэўны “прагал” у творчасці В. Зуёнка. “Чаго яшчэ, на нашу думку, не хапае паэту? – разважаў крытык. – Галоўным чынам умельства арганічна, не здраджваючы сваім індывідуальным творчым схільнасцям, не парываючы са светам прыроды і казкі, а “знутры” гэтага свету, пераключыцца на тэму гісторыі, зразуметай не толькі як мінулае, але перш за ўсё як сучаснасць, як сённяшні дзень” [4, с. 3]. Паэт досыць хутка запоўніў гэту нішу, выявіўшы ўменне натуральна спалучаць розныя часавыя пласты – у творы паядналіся свет прыроды, казка, міф, старажытныя язычніцкія вераванні, хрысціянства...

“Лукам’е” апавядае пра падзеі беларускага Сярэднявечча, разам з тым гэты твор вельмі сучасны, дзякуючы яго праблематыцы: цэнтральнай з’яўляецца праблема нацыянальна-дзяржаўнай ідэнтыфікацыі беларускага народа. Пытанні, якія турбавалі галоўнага героя твора князя Івана Лукомскага на схіле XV стагоддзя, не страцілі сваёй вастрыні і актуальнасці. Вобраз Івана Лукомскага працягвае галерэю нацыянальных вобразаў змагароў за Беларускі Шлях, а лёс такіх людзей, бадай, заўсёды трагічны. Іван дбае аб вяртанні былой сілы свайму княству, ён памятае слаўныя часы, калі на абароне беларуска-ліцвінскіх зямель стаялі “воля Міндоўга і Вітаўта меч”. Для героя існуюць тры рэальныя шляхі адрадзіць “род свой і веліч”, аднак усе яны (хаўрус з польскім каралём і акаталічванне краю, кіраўніцтва сялянскім бунтам, саюз з праваслаўнай Масквой) аказваюцца непрымальнымі.

У кантэксце паэмы адгалінаванні хрысціянства – не толькі і не проста рэлігія: і каталіцызм, і праваслаўе выступаюць сродкамі палітычных маніпуляцый. Прыкрываючыся імем Бога, клопатам пра душу, і Польшча, і Масква імкнуцца ў першую чаргу да пашырэння дзяржаўных межаў за кошт зямель сваіх адзінаверцаў – каталікоў-“палякаў” і праваслаўных-“рускіх”. Сутнасць веравызнання самога Івана Лукомскага неадназначная, нават парадаксальная. З аднаго боку, у процістаянні “рэлігійным перараджэнцам” Сымону-Сігізмунду і Мацясу-Маціясу ён выяўляе сябе шчырым праваслаўным вернікам, выступае супраць акаталічвання. З другога – абагаўляе прыроду, як язычнік: *“Бог ёсць прырода… Ніхто і ніколі / Веліч стыхіі адолець не мог...”* [1, с. 33]. Тым не менш хрысціянства так і не змагло цалкам “адваяваць” душу Івана ў язычніцтва: першабытна-міфалагічныя ўяўленні, пакланенне прыродным стыхіям –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сапраўдная рэлігія князя. Духоўна герой застаецца з тымі, хто моліцца сваім багам і найперш – Агню і Святым Дубам, – з Жыжалем, Данутай, Стасяй.

Міфалагемы *агонь* і *дуб* нясуць у паэме адмысловую ідэйна-сэнсавую нагрузку. Сімволіка агню ў славянскай міфалогіі мае дваісты характар, у дачыненні да “Лукам’я” амбівалентнасць агню разумеецца вельмі шырока, праяўляецца ў розных семантычных кантэкстах. Ён разгараецца, як *“агонь начлежны ці агонь купальны, / Агонь ахоўны ці агонь знішчальны, / Агонь сігнальны ці агонь мяцежны, / Агонь духоўны ці агонь пасмешны, / Агонь суцешны ці агонь грахоўны”* [1, с. 7]. Агонь у паэме “расказвае” пра жыццё і смерць герояў, ён становіцца сведкам (і прычынай) іх смерці, сведкам (і прычынай) развіцця гісторыі ўвогуле (у многіх культурах свету агонь з’яўляецца сімвалам зараджэння чалавечай цывілізацыі).

На самым пачатку твора ў цемру “змрочнага часу” на пераломе стагоддзяў урываецца полымя “ачышчальнага” агню. Падобнае ачышчэнне “ад бунтоў, ад нягод, ад прашэнняў” стварае вобраз зямнога пекла, у якім пакутуюць бязвінныя людзі. Заканчваецца паэма вобразам абярэжнага агню, што выпраменьваецца “рукатворным сонцам” – электрастанцыяй. Варожаму агню мінулага супрацьстаіць спрыяльны для чалавека агонь будучыні. Аднак паэтава надзея на перамогу дабра і стваральнага розуму, увасобленая ў вобразе электрастанцыі, як паказаў час, не апраўдала сябе. Менавіта ў эпоху “рукатворных сонцаў” усё больш слабай становіцца сувязь чалавека і прыроды, парушаецца іх гарманічнае суіснаванне.

Узорам гармоніі чалавека з прыроднымі стыхіямі паўстае ў “Лукам’і” свята Купалля, якое, па словах К. Камейшы, “апісана аўтарам надзвычай каларытна і дэталёва. Такіх малюнкаў мы, здаецца, не мелі яшчэ ў нашай паэзіі” [2, с. 197]. В. Зуёнак не шкадуе светлых, сонечных фарбаў, малюючы купальскі летні дзень: *“Сонечна доле і ў паднябессі, / Сонца ныряе ў азёрнай вадзе, / Сонечна ў полі, сонечна ў лесе, – / Сонца купальскай дарогай ідзе”* [1, с. 24]. Ноччу на змену нябеснаму сонцу прыходзіць зямное – вогнішча, яго распальвае Стася паходняй, пазычыўшы у ахвярніка агню, яно ачышчае, адпрэчвае злых духаў, дорыць радасць, святочны настрой. Функцыю “ачышчэння” выконвае і прынесенае “цывілізаванымі” чужынцамі вогнішча інквізіцыі, паглынаючы прыхільнікаў старажытнай паганскай веры. Прызначэнне абодвух агнёў, здаецца, адно, аднак сутнаснае напаўненне, вынікі вельмі розныя.

Такім чынам, шматаблічны агонь часам выступае ў своеасаблівай апазіцыі да сябе самога: з агнём кахання, якое разгарэлася паміж маладым князем і Жыжалевай унучкай, змагаецца “агонь-душагуб” – жыццё змагаецца са смерцю. Дарэчы, у “Лукам’і” смяротны агонь запальваецца тройчы (аўтар не адступае ад фальклорна-міфалагічнага прыёму цыклізацыі): спальваецца прыгажуня Стася, у полымі гіне Жыжаль, урэшце агнём “карануецца” князь Іван. “Меч і агонь” у паэме таксама сімвалізуюць уладу Лукомскага, абаронцы сваёй зямлі і народа ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ворагаў, агнём і мячом заваёўнікі імкнуліся скарыць, падпарадкаваць сабе Лукомскае княства. Вялікаму Агню маліліся продкі-язычнікі, у яго верылі – агнём выпальвалася гэтая вера, насаджалася новая, агнём адваёўвалася душа беларуса ў прыродных багоў. Злачынствы новых уладароў і служак новай веры нараджалі вогненную помсту: не змогшы дараваць смерць унучкі, Жыжаль чырвоным пеўнем пускае на вецер касцёл. Жыжаль – “сваяк” агню, аднак і ён гіне ў полымі, распаленым уласнай помстай, тым самым зліваецца, паядноўваецца са сваім богам. Агонь можа быць як сродкам помсты ў руках чалавека, так і сам можа адпомсціць.

Побач з вобразам агню выступае ў паэме цесна звязаны з ім вобраз дрэва (дуба), не менш значны для беларускай культуры. “…Дрэва, – разважае Т. Шамякіна, – суадносіцца з натурфіласофскаю стыхіяй агню ўжо хаця б таму, што яно добра гарыць, дае святло і цяпло. Крона дрэва падобная на полымя. У гарэнні дрэва аддае сябе, падказваючы маральны закон для чалавека – дабро і самаахвярнасць” [3, с. 33]. Дрэва сімвалізуе імкненне да ідэалу, да Сонца, да Бога. Добрая і самаахвярная вогнепаклонніца Стася (гэтыя якасці яна атрымала ў спадчыну ад апошняй вайдэлоткі Дануты) прымае смерць, будучы прывязанай менавіта да дуба. У Святых Дубах дзяўчына малілася, дуб дзяліў з ёю радасць кахання, дуб суправаджае яе і ў апошні шлях. Дрэва, нібы жывая істота, адчувае несправядлівасць пакарання Жыжалевай унучкі, суперажывае дзяўчыне: *“Кволай былінкай дуб захістаўся, / Вусны адчуўшы на шорсткай кары”* [1, с. 30]. Прыняўшы смерць разам са Стасяй, дуб, высахлы і абпалены, сведчыць усім пра знявечаны лёс дзяўчыны.

На апошняй дарозе сустракаецца са свяшчэнным для язычнікаў-беларусаў дрэвам і князь Лукомскі. Сімвалам пакалечанага, загубленага жыцця ўспрымаецца “дуб, стары, абгарэлы, бязверхі”, што “рукі распяў над Іванам” – нібы хацеў захінуць ад вогненнай смерці. Нязломная моц дуба і мяцежны дух агню паядналіся ў вобразе Жыжаля, у дуба просіцца Данута, каб ахінуў яе ад гневу Перуна. Дуб для герояў паэмы – адначасова і боства, і брат: так у паэме выяўляюцца анімістычныя вераванні беларускага народа. В. Зуёнак надзяляе сілы прыроды, у першую чаргу агонь і дуб, якасцямі жывых істот, яны дзейнічаюць нароўні з астатнімі героямі твора.

Не без падстаў І. Шпакоўскі ўсю мастацкую структуру “Лукам’я” асацыятыўна суадносіць з дрэвам: “Свет падаецца такім, якім ён уяўляўся нашым продкам, з касмічнай апорай – “усясветным дрэвам”, у славянскай мадыфікацыі – святым дубам. Унізе, ля каранёў святога дуба, знаходзяцца апраметная, родныя магілы продкаў, капішча, усярэдзіне – ствол, зямля, жывёла і чалавек, угары – крона, агонь, птушкі. Гэта вертыкальная структура, у гарызантальнай – квадрат у клетцы з Іванам; магічныя кругі, якія замкнула вакол Івана купальскай ноччу Стася” [5, с. 308]. Сапраўды, структура “Лукам’я” надзвычай складаная: паэма мае сем раздзелаў, якія апавядаюць пра шлях героя на сваю Галгофу. Твор

адкрываецца зачынам – своеасаблівым гімнам агню, далей, па кантрасту з “вогненным” пачаткам, ствараецца змрочная карціна свету на зыходзе стагоддзя: *“На зыходзе было стагоддзе. / Смутны час для цароў і тыранаў, / Час бяссонніц, што прывідна ходзяць / Цяжкім ценем ахвяр пакараных. / Час пажадны, няўтульны, нервовы, / Час вар’ятаў і самагубцаў”* [1, с. 8].

У кожную з сямі частак уключаюцца значныя ў ідэйна-сэнсавым плане Іванавы мроі-ўспаміны (толькі апошняя пераносіць у будучыню). Мроі князя – яго перадсмяротная споведзь самому сабе – рэтраспектыўна ўзнаўляюць найбольш важныя моманты жыцця Лукомскага. Успаміны арганічна нанізваюцца на асноўны кампазіцыйны стрыжань: рэаліі апошняга дня жыцця героя і яго адчуванні – аўтар карыстаецца кінематаграфічным прыёмам “наплыву”. Так, вербы маскоўскай вуліцы ўваскрашаюць у памяці князя сялянскі вербны бунт, “шэры тыранік” верабей – шэрых жаўранкаў з вясны кахання…

Увядзенне галасоў летапісца, бацькі, сялян і іншых – яшчэ адзін арыгінальны кампазіцыйны прыём. “Галасы” ствараюць разгорнутую панараму падзей і пры гэтым засцерагаюць твор ад празмернай апісальнасці. *Голас летапісца* ўводзіць гісторыка-паэтычную даведку пра “белых русічаў”, распавядае пра светлыя і трагічныя старонкі іх жыцця: *“Сам узняўся ты кронай, / Векавечны народ. / Белагрывай Пагоняй / Узыходзіў твой герб… / Беларускія гоні, / Белы месячык-серп”* [1, с. 13].

Напамінам пра Радзіму, запаветам для Івана гучыць *Голас бацькі*: *“І на паклон адзінае / Мушу сказаць сынам: / Здраджваем мы Радзіме, / Радзіма – не здрадзіць нам. / <…> Страшней, чым зямля без неба, / Страшней, чым пятля на суку, / Здрадзіўшы, бачыць з хлебам / Працягнутую руку...”* [1, с. 15]. Калі Голас летапісца і Голас бацькі ўспрымаюцца “каментарыямі за кадрам”, то сялянскія *Галасы з-пад стрэх* “дзейнічаюць” у творы побач з іншымі героямі-персанажамі. Яны з горыччу гавораць пра чорныя дні на сваёй зямлі (здзекі “Сігізмундавай світы” і служак касцёла) – аўтар выкарыстоўвае драматычны прыём: рэплікі сялян выконваюць інфармацыйна-апісальную функцыю, аднак не абцяжарваюць твор, а надаюць яму дынаміку і напружанасць. *Голас часу* апавядае аб накіраванасці прагрэсу: чалавецтва развіваецца “ад камня да стралы” і “ад стралы да кулі”. Цень Івана Лукомскага выступае супраць крывавага прагрэсу і ў той жа час спяшаецца туды, дзе яго сыны рыхтуюцца да бітвы з чужынцамі. Тым самым В. Зуёнак прызнае справядлівасць і нават неабходнасць змагання за ўласную годнасць, за волю і самастойнасць сваёй Радзімы.

У паэме “Лукам’е” пры мастацкай рэканструкцыі мінулага, такім чынам, знайшлі шырокае ўвасабленне і творчае пераасэнсаванне анімістычныя вераванні народа, міфалагічныя і фальклорныя ўяўленні, адзнакі хрысціянскага светапогляду. Падобны сінтэз дазволіў аўтару стварыць гістарычна верагодную карціну жыцця нашых продкаў, паказаць складаную прыроду нацыянальнага этнатыпу, сцвердзіць ідэю выключнасці і ўнікальнасці Беларускага Шляху.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура

1. Зуёнак, В. Выбраныя творы : у 2 т. / В. Зуёнак. – Мінск : Маст. літ., 1996–1998. – Т. 2 : Пяцірэчча : кніга паэм. – 1998. – 319 с.
2. Камейша, К. З вышыні сэрца / К. Камейша // Полымя. – 1985. – № 6. – С. 193–197.
3. Шамякіна, Т. І. Міфалогія Беларусі (нарысы) / Т. І. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 398 с.
4. Шпакоўскі, І. Кніга яшчэ ў дарозе / І. Шпакоўскі // Літ. і мастацтва. – 1968. – 24 верас. – С. 3.
5. Шпакоўскі, І. С. Пераадоленне. Пошук выхаду са стылявога тупіка ў Янкі Сіпакова, Рыгора Барадуліна, Васіля Зуёнка / І. С. Шпакоўскі // Беларуская літаратура XX ст. : вучэб. дапам. – Мінск, 2001. – С. 297–314.

Заяц Наталля Віктараўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, Мінск, Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ